УДК 94(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ *Л. А. Козік;*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны РІВШ *С. В. Паноў*

Пад навуковай рэдакцыяй *А. В. Касовіча*

**Багдановіч, І. І.**
Б142 Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк ; пад навук. рэд. А. В. Касовіча. – Мінск : БДПУ, 2017. – 20[illegible] с.
ISBN 978-985-541-392-0.

Дапаможнік грунтуецца на кароткіх апісаннях, лагічных схемах і тэкставых табліцах, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя праблемы зместу курса методыкі выкладання гісторыі ў сучаснай школе. Утрымлівае кампаненты, неабходныя для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх прафесійных кампетэнцый настаўніка гісторыі: прыведзены прыкладны план вывучэння кожнай тэмы, грунтоўны спіс навукова-метадычнай літаратуры і блок самакантролю вынікаў засваення, які складаецца з пытанняў і заданняў і тэставых заданняў па асноўных раздзелах курса методыкі выкладання гісторыі.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам і ўсім, хто цікавіцца методыкай навучання гісторыі.

**УДК 94(075.8)**
**ББК 63.3я73**

**ISBN 978-985-541-392-0**

© Багдановіч І. І., Корзюк А. А., 2017
© Афармленне. БДПУ, 2017

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк***

# МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ Ў АПІСАННЯХ, СХЕМАХ І ТАБЛІЦАХ

Рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Мінск
БДПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *ТЭМА 11. ПАЎТАРЭННЕ І ПРАВЕРКА ВЕДАЎ У НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ*

### 11.1. МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ ПАЎТАРЭННЯ

#### План вывучэння тэмы

1. Прызначэнне паўтарэнняў у навучанні гісторыі. 2. Асноўныя віды паўтарэння і методыка яго арганізацыі. 3. Дамашнія заданні па гісторыі.

#### Літаратура для самастойнага вывучэння


1. Багдановіч, І. І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. – Мінск : БДПУ, 2009.
2. Глазырина, Т. Н. Методика преподавания истории : учеб.-метод. комплекс для студ. / Т. Н. Глазырина. – Новополоцк : ПГУ, 2011.
3. Вяземский, Е. Е. Теория и методика преподавания истории в школе : учебник для студ. вузов / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова. – М. : ВЛАДОС, 2003.
4. Гінчук, В. В. Гісторыя Беларусі ў 10 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. В. Гінчук. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2014.
5. История. 11 класс. Рабочая тетрадь / Г. А. Космач [и др.] ; под ред. Г. А. Космача. – Минск : Аверсэв, 2015.
6. Короткова, М. В. Практикум по методике преподавания истории в школе : учеб. пособие для студ. высш. учебн. заведений / М. В. Короткова, М. Т. Студеникин. – М. : ВЛАДОС, 2000.
7. Лейбенгруб, П. С. О повторении на уроках истории СССР в 7–10 классах / П. С. Лейбенгруб. – М. : Просвещение, 1987.


#### Кароткае апісанне асноўнага зместу тэмы

I. У працэсе навучання гісторыі паўтарэнне выконвае функцыі: 1) папярэджання забывання; 2) абагульнення і сістэматызацыі ведаў; 3) развіццёвую і навучальную (паглыблення ведаў і фарміравання



спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці); 4) кантролю і дыягностыкі адукацыйных вынікаў навучання. Улічваючы важную ролю паўтарэння ў навучанні гісторыі, трэба імкнуцца да сістэматычнай яго арганізацыі на кожным уроку.

II. У тэорыі і практыцы навучання гісторыі праблема арганізацыі паўтарэння знайшла шырокае адлюстраванне. Гэта стварае магчымасць вызначыць методыку арганізацыі асноўных відаў паўтарэння ў навучанні гісторыі.

1. *Першапачатковае паўтарэнне, або замацаванне* матэрыялу з раней засвоеным, праверыць ступень засваення новага матэрыялу. Першапачатковае паўтарэнне – абавязковы структурны элемент арганізацыі ўрока гісторыі ў V–VIII класах. У IX–XI класах ён можа адсутнічаць як самастойны этап урока, але ў любым выпадку пры падвядзенні вынікаў урока павінна ажыццяўляцца сістэматызацыя і абагульненне вывучанага на ўроку, што ў пэўнай ступені замяняе першапачатковае паўтарэнне на ўроку.

2. *Уступнае паўтарэнне* праводзіцца ў пачатку навучальнага года або перад пачаткам вывучэння новай тэмы ці раздзела. Яно мае мэтай актуалізаваць у памяці вучняў засвоеныя раней веды, неабходныя для лепшага разумення новага вучэбнага матэрыялу.

3. *Бягучае паўтарэнне* з'яўляецца асноўным відам паўтарэння. Гэта паўтарэнне раней пройдзенага ў тэматычнай сувязі са зместам новага ўрока. Бягучае паўтарэнне можа ажыццяўляцца на ўсіх этапах урока: у час праверкі дамашняга задання, пры падрыхтоўцы да вывучэння і ў працэсе вывучэння новага матэрыялу на ўроку, у ходзе замацавання і пры выкананні дамашняга задання. Усё гэта сведчыць, што бягучае паўтарэнне, сапраўды, з'яўляецца асноўным відам паўтарэння ў навучанні гісторыі. Шкада, што многія настаўнікі аб гэтым забываюць.

4. *Абагульняльнае паўтарэнне*. Абагульняльнае паўтарэнне ахоплівае матэрыял тэмы або раздзела курса гісторыі, а ў некаторых выпадках сістэматызуе матэрыял з розных тэм і раздзелаў па пэўных праблемах і баках жыцця грамадства. Яму прысвячаюцца спецыяльныя ўрокі.

Найбольш важнымі ўмовамі павышэння эфектыўнасці ўрока паўтарэння і абагульнення, на нашу думку, з'яўляюцца: 1) правільны



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ